

*Актуальныя праблемы грамадскага жыцця*

2147

# Захаваць міжканфесійную згоду і духоўныя каштоўнасці

**У гісторыі нашай краіны ніколі не было сур'ёзных міжнацыянальных альбо рэлігійных канфліктаў. Беларусы заўсёды жылі і жывуць у згодзе з прадстаўнікамі больш за 140 нацыянальнасцей і 25 рэлігійных канфесій і напрамкаў. Аб тым, што ляжыць у аснове верацярпімасці і міжнацыянальнага ўзаемадаверу жыхароў Беларусі, якія задачы стаяць сёння перад нашай дзяржавай у гэтай сферы грамадскага жыцця, як адбіваюцца на сучаснай сістэме адукацыі змены ва ўзаемаадносінах дзяржавы з рэлігійнымі канфесіямі, прадстаўнікамі розных нацыянальнасцей, расказвае ў сваім інтэрв'ю часопісу Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Леанід Паўлавіч ГУЛЯКА.**

**– Скажыце, калі ласка, якое на гэты час агульнае сацыяльна-псіхалагічнае становішча ў канфесійнай сферы жыцця беларускага грамадства?**

– У рэспубліцы ідзе працэс стабілізацыі ўзроўню рэлігійнасці насельніцтва і праяўлення цікаўнасці да гістарычна традыцыйных канфесій, перш за ўсё праваслаўя і каталіцызму.

Неабходна падкрэсліць вызначальную ролю Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа, неаддзельнасць ад агульнай гісторыі Беларусі Каталіцкай, Евангелісцка-лютэранскай цэркваў, іудаізму і ісламу.

На сённяшні дзень у краіне зарэгістравана і дзейнічае 2886 рэлігійных суполак, 25 канфесій і рэлігійных напрамкаў, а таксама 144 агульнаканфесійныя арганізацыі, у іх ліку епархіі, манастыры, брацтвы, місіі, духоўныя навучальныя ўстановы. Дзейнічае 1349 рэлігійных суполак Беларускай праваслаўнай царквы, 438 – Рымска-каталіцкай, 45 іудзейскіх і 24 мусульманскія суполкі, 14 пратэстанцкіх рэлігійных напрамкаў.

**– Якія магчымасці ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва рэлігійных канфесій з рознымі сацыяльнымі сферамі і інстытутамі існуюць і рэалізуюцца сёння ў нашым грамадстве?**

– Апошнім часам значна актывізавалася разнапланавая сацыяльная і дабрачынная дзейнасць рэлігійных канфесій, іх удзел у жыцці рэспублікі і рэгіёнаў, духоўным адраджэнні грамадства. Значныя прэферэнцыі, дадзеныя дзяржавай рэлігійным арганізацыям, дазваляюць у поўнай меры рэалізоўваць дабрачынныя, адукацыйныя і іншыя сацыяльныя праекты.

У якасці яскравага прыкладу канструктыўнага дыялога дзяржавы і рэлігійнай канфесіі можна прывесці заключанае ў 2003 годзе Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой, у рамках якога распрацаваны, падпісаны і рэалізуюцца трынаццаць сумесных праграм супрацоўніцтва па лініях розных міністэрстваў і ведамстваў.

Адпаведна палажэнням гэтага першага ў гісторыі Беларусі дакумента такога роду дзяржава прызнае ролю Праваслаўнай царквы як аднаго з важнейшых і ўплывовых сацыяльных інстытутаў сучаснага грамадства. У сваю чаргу, Царква зыходзіць з таго, што інстытут дзяржавы выступае як гарант захавання і прымна-



жэння рэлігійных, духоўных і гуманістычных традыцый. Гэтыя пагадненне і праграмы забяспечваюць узаемадзеянне ў такіх сацыяльна значных сферах жыцця, як адукацыя, культура, ахова гісторыка-культурнай спадчыны, навука, сацыяльная ахова, ахова здароўя, ахова прыроды, пераадоленне вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, патрыятычная работа і т.п.

**– Якія змены адбываюцца ў нацыянальнай адукацыйнай сістэме падчас выканання Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквою?**

– Распрацаваны падрабязны план мерапрыемстваў па рэалізацыі Пагаднення, які канкрэтызуе асноўныя яго палажэнні, у тым ліку і ў адукацыйнай сферы.

Так, Міністэрства адукацыі разглядае магчымасць уключэння ў планы работы класных кіраўнікоў раздзела «Культура і рэлігія», распрацоўвае методыку выкладання пытанняў рэлігіязнаўства ў рамках дзеючых курсаў. Таксама сумесна з Беларускім Экзархатам разглядаецца пытанне аб стварэнні новых вучэбных курсаў і праграм, прысвечаных рэлігіі.

Розныя рэгіёны нашай краіны ўжо маюць цікавы і эфектыўны вопыт супрацоўніцтва адукацыі і рэлігіі.

Напрыклад, у Мінскай вобласці ў праграмы нядзельных школ уключаны пытанні фарміравання здаровага ладу жыцця, праводзяцца заняткі па маральна-палавым выхаванні дзяцей і падлеткаў, прафілактыцы нікацінавай залежнасці, алкагалізму, наркаманіі, ВІЧ/СНІДу. А ў нядзельных школах Брэсцкай і Пінскай епархій уводзяцца дысцыпліны па экалагічнай адукацыі і выхаванні.

У Мінскім суvoраўскім вучылішчы з 2005 года праводзіцца праваслаўная гадзіна, на якой выступаюць свяшчэннаслужыцелі Мінскай епархіі.

У Магілёўскай вобласці пры ўдзеле і садзейнічанні Царквы арганізуюцца розныя цікавыя экскурсіі для школьнікаў па духоўна значных для нашага народа месцах у Беларусі і за яе межамі. А ў абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі фарміруецца банк даных па метадычным забеспячэнні сумеснай работы з епархіямі Беларускай праваслаўнай царквы, а таксама па папярэджанні распаўсюджвання ўплыву псеўдарэлігійных арганізацый.

На базе гарадской гімназіі Ліды праходзяць заняткі пастаяннага семінара «Беларуская праваслаўная царква і школа», у якім прымаюць удзел настаўнікі, клас-

ныя кіраўнікі, сацыяльныя педагогі і святчэннаслужыцелі.

Праект дзяржаўна-царкоўнай праграмы па духоўна-патрыятычным выхаванні моладзі рыхтуецца ў Віцебскай вобласці.

Ужо сталі традыцыйнымі сумесныя з прадстаўнікамі рэлігій навукова-практычныя канферэнцыі і чытанні. У якасці прыкладу можна назваць Кірыла-Мяфодзіеўскія, Свята-Міхайлаўскія і Ефрасіннеўскія педагагічныя чытанні, якія былі праведзены ў Мінску і Гомелі пры непасрэдным удзеле Міністэрства адукацыі.

***Даведка***

У кастрычніку 2005 года Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) прыняла рэзалюцыю 1720 (2005) «Адукацыя і рэлігія». ПАСЕ прыйшла да высновы, што «тэрарыстычныя акты, расізм, ксенафобія, міжнацыянальныя канфлікты маюць рэлігійны аспект». Пры гэтым адзначана, што ў сем'ях веданне рэлігіі адыходзіць, а неадукаванасць і фанатызм растуць. ПАСЕ заклікала Камітэт міністраў «распрацаваць магчымыя падыходы да навучання высновам рэлігій у пачатковай і сярэдняй школах», а ўрады – «забяспечыць навучанне асновам рэлігіі ў дзяржаўных пачатковых і сярэдніх школах».

**– Як сёння выкарыстоўваюцца вялікія магчымасці рэлігіі ў захаванні і развіцці гістарычнага, культурнага, духоўнага патэнцыялу беларускага народа?**

– Рэлігія заўсёды іграла выключную ролю ў станаўленні духоўнасці і культуры чалавека. І сёння ў нашым грамадстве ідзе працэс рэлігійнага адраджэння, вяртання духоўных і маральных традыцый у розныя сферы жыцця.

Так, прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук прымаюць актыўны ўдзел у навуковых мерапрыемствах, арганізаваных сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой, у тым ліку ў падрыхтоўцы міжнароднага выдавецкага праекта «Праваслаўная энцыклапедыя». Беларуская праваслаўная царква заўсёды прымае ўдзел у святкаванні Дня беларускай пісьменнасці.

Акрамя гэтага, трэба адзначыць немалаважную ролю рэлігійных дзеячаў у захаванні помнікаў гісторыі і культуры, да якіх адносяцца і шматлікія культавыя пабудовы. У прыватнасці, менавіта прадстаўнікі рэлігійных канфесій выконваюць асветніцкую дзейнасць па тлумачэнні неабходнасці захавання гістарычнага аблічча будынкаў, якія маюць гісторыка-архітэктурную каштоўнасць.

Рэлігійныя канфесіі актыўна ўдзельнічаюць у культурным жыцці нашай рэспублікі: арганізуюць канцэрты і фестывалі духоўнай музыкі, такія як вядомы фестываль «Магутны Божа», розныя мастацкія і тэматычныя выставы, садзейнічаюць развіццю тэатральнага мастацтва.

Разам з Беларускім Экзархатам падрыхтаваны лекцыі для кіраўнікоў дзяржаўных газет і радыё. Гэтыя лекцыі чытаюцца ў рамках курсаў павышэння кваліфікацыі ў Інстытуце вышэйшых кіраўніцкіх кадраў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Агульнавядома, што царква заўсёды ўскладала на сябе высакародную місію служэння тым, каму цяжка змагацца за жыццё самому: хворым, інвалідам, сіротам, састарэлым людзям. На сённяшні дзень святчэннаслужыцелям забяспечаны доступ у дамы-інтэрнаты для дзяцей-інвалідаў і састарэлых, якім вельмі патрэбны міласэрнасць, добрае слова, маральная і псіхалагічная падтрымка. Акрамя гэтага, актыўна развіваецца сумесная царкоўна-дзяржаўная дабрачынная і гуманітарная дзейнасць, накіраваная на аказанне дапамогі людзям з абмежаванымі магчымасцямі, і перш за ўсё – дзецям. Так, рэгулярна праводзяцца тыдні «Міласэрнаць», падчас якіх арганізуюцца дабрачынныя абеды для малазабяспечаных грамадзян. А ў вядомым конным клубе пасёлка Ратамка пры падтрымцы Праваслаўнай царквы атрымалі магчымасць займацца цікавым і карысным відам спорту дзеці-інваліды.

Дзяржаўныя, грамадскія і рэлігійныя арганізацыі разам вядуць вельмі патрэбную і актуальную сёння работу па фармі-

раванні здаровага ладу жыцця і павышэнні статуса сям'і. Яскравым прыкладам такога супрацоўніцтва з'яўляецца курс рэабілітацыі дзяўчынак-падлеткаў з сацыяльна небяспечных сем'яў, які праводзіцца ў Свята-Ксеніеўскім манастыры, што ў Барысаўскім раёне.

Царква ўдзельнічае і ў справе пераадолення вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС: захаванні і аднаўленні помнікаў гісторыі і архітэктуры ў забруджаных радыенуклідамі раёнах, добраўпарадкаванні могілкаў у зоне адчужэння, правядзенні інфармацыйнай работы з насельніцтвам.

**– Якую ролю ў захаванні міжканфесійнай згоды адыгрывае наша дзяржава?**

– Актыўны і паслядоўны ўплыў дзяржавы на рэлігійныя працэсы дазваляе падтрымліваць міжнацыянальную і міжканфесійную згоду і стабільнасць, якія ў беларускім грамадстве абумоўлены гістарычнымі традыцыямі мірнага ўзаемадзеяння, даўнімі і трывалымі сувязямі паміж прадстаўнікамі нацыянальных груп і розных рэлігійных канфесій. У сваёй дзейнасці органы ўлады Рэспублікі Беларусь імкнуцца да захавання міжнацыянальнага і міжрэлігійнага даверу, ажыццяўлення цывілізаваных формаў дыялога.

У 2002 годзе прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях», які грунтуецца на прызнанні роўнасці ўсіх рэлігій і дазваляе ўмацоўваць дзяржаўныя прыярытэты ў канфесійнай палітыцы, узмацняць кантроль за выкананнем заканадаўства аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацый, а таксама не дапускаць распаўсюджвання ў рэспубліцы псеўдарэлігійных, дэструктыўных арганізацый. Намаганнямі рэспубліканскіх органаў кіравання, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў улады не дапускаюцца якія-небудзь канфлікты на рэлігійнай аснове, манапалізацыя духоўнага жыцця і раскол грамадства па канфесійнай ці нацыянальнай прыналежнасці. І менавіта на наш орган кіравання ўскладзены абавязак каардынацыі пытанняў царкоўна-дзяржаўнага ўзаемадзеяння.

**– Ад імя рэдакцыі і чытачоў часопіса я шчыра дзякую вам, Леанід Паўлавіч, за цікавую і насычаную разнастайнай інфармацыяй размову і выказваю спадзяванне на новыя, карысныя нашым чытачам артыкулы, сустрэчы і інтэрв'ю.**

***Размову вяла А. В. Позняк***

***Даведка***

З 1988 года па 2005 год рэлігійным арганізацыям вернута 1024 культавыя будынкі;

• у канцы 2004 года каталіцкім вернікам быў перададзены комплекс будынкаў Брыгіцкага кляштара ў г. Гродне;

• усяго ў рэспубліцы дзейнічае 2006 культавых будынкаў, у тым ліку 1159 – Беларускай праваслаўнай царквы, 427 – Рымска-каталіцкай царквы, 375 –пратэстанцкіх накірункаў;

• сёння вядзецца будаўніцтва 274 культавых будынкаў.

# Выдержки из Соглашения о сотрудничестве между Республикой Беларусь и Белорусской православной церковью от 12 июля 2003 г.

**Статья 1**

Государство признаёт, что:

Церковь является одним из важнейших социальных институтов, чей исторический опыт, духовный потенциал и многовековое культурное наследие оказали в прошлом и оказывают в настоящем существенное влияние на формирование духовных, культурных и национальных традиций белорусского народа;

духовные и культурные ценности, хранимые Церковью, представляют собой составную часть исторического достояния Беларуси и национального самосознания;

взаимодействие с Церковью выступает важным фактором общественной стабильности, гражданского единства и межконфессионального мира на белорусской земле;

Церкви гарантируются свобода внутренней организации, исполнения культовых обрядов и иных видов деятельности, а также право церковной юрисдикции на своей канонической территории в рамках Конституции и законодательства Республики Беларусь.

**Статья 2**

Церковь признаёт, что:

Государство является гарантом сохранения духовных и культурных традиций белорусского народа, в том числе исторически формировавшихся под влиянием Церкви;

отношение к Государству базируется на принципе уважения к нему как социальному институту, призванному обеспечивать общественный порядок, защищать национальные интересы, нравственность, охранять духовные и культурные ценности народа;

сотрудничество с Государством способствует активизации духовной и социальной деятельности Церкви, расширению возможностей для совместного противодействия псевдорелигиозным структурам, представляющим опасность для личности и общества.

**Статья 3**

Государство и Церковь признают, что приоритетными направлениями их сотрудничества являются общественная нравственность, воспитание и образование, культура и творческая деятельность, охрана, восстановление и развитие исторического и культурного наследия, здравоохранение, социальное обеспечение, милосердие, благотворительность, поддержка института семьи, материнства и детства, попечение о лицах, находящихся в местах лишения свободы, воспитательная, социальная и психологическая работа с военнослужащими, охрана окружающей среды.

Стороны считают целесообразным, начиная с 2003 года, принятие по указанным направлениям соответствующими республиканскими органами государственного управления, иными государственными органами и Церковью совместных программ в целях согласованного и результативного сотрудничества в следующих сферах общественной деятельности:

воспитание и образование — Министерство образования;

наука — Национальная академия наук Беларуси, Министерство образования;

культура и творческая деятельность, охрана, восстановление и развитие исторического и культурного наследия — Министерство культуры, облисполкомы, Минский горисполком;

здравоохранение — Министерство здравоохранения;

социальная защита, благотворительность, содействие укреплению института семьи, материнства и детства — Министерство труда и социальной защиты, облисполкомы, Минский горисполком;

средства массовой информации — Министерство информации;

профилактика правонарушений, попечение о лицах, находящихся в местах лишения свободы, и лицах, отбывших наказание, — Министерство внутренних дел;

воспитательная, социальная и психологическая работа с военнослужащими и сотрудниками военизированных формирований — Министерство обороны, Государственный комитет пограничных войск, Министерство внутренних дел, Министерство по чрезвычайным ситуациям;

охрана окружающей среды — Министерство природных ресурсов и охраны окружающей среды, Комитет по проблемам последствий катастрофы на Чернобыльской АЭС при Совете Министров Республики Беларусь.